*УДК 398.3*

*І. А. ШВЕД*

# «МІФАПАЭТЫЧНАЯ ЭТЫЯЛОГІЯ» КАМЕНЯ Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна*

*(Паступіў у рэдакцыю 02.04.2013)*

Можа [камень] з неба ўпаў,
а можа і з зямлі вырас
*(Г. Н. Казловіч з в. Дунілавічы Пастаўскага р-на)*

Неабходнасць даследавання культурна-сацыяльных характарыстык чалавечага існавання ў свеце, зрухаў у этыка-анталагічных адносінах чалавечых калектываў да свету жыцця (што звязана з узнікненнем драматычнай экзістэнцыяльнай сітуацыі ў біясацыяльным лёсе чалавецтва і актуалізацыяй эсхаталагічных чаканняў, пашырэннем сімулятыўных пустот у культуры), а таксама важнасць вывучэння і сінтэзавання найлепшых духоўных набыткаў нашых продкаў, нераспрацаванасць шырокага кола праблем семіятычнай арганізацыі свету, адным з галоўных інструментаў якой выступае ландшафтны код, накапленне адпаведнага багатага фактычнага матэрыялу, які чакае грунтоўнага сістэмнага вывучэння паводле новых напрацовак у галіне фалькларыстыкі, семіётыкі, этналінгвістыкі, культуралогіі і іншых гуманітарных навук, добрая захаванасць архаічнага паводле сваіх вытокаў вобраза каменя і жывучасць звязаных з ім міфапаэтычных уяўленняў (што выразна адбілася ў розных відах мастацтва) вызначаюць актуальнасць тэмы прапанаванага артыкула.

Вобраз каменя, прадстаўлены ў жанрах беларускага фальклору, трапляў у поле зроку шэрага навукоўцаў, якія выказвалі розныя меркаванні наконт генезісу і семантыкі названага феномена. А. Кіркор яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. указваў на тое, што на Беларусі амаль кожны камень вялікіх памераў ці незвычайнай формы ўшаноўваўся мясцовым насельніцтвам і меў адметныя паданні наконт свайго паходжання. Сучасныя даследаванні ўсё больш пераканаўча пацвярджаюць слушнасць меркавання пра касмаганічную трактоўку каменя як першаэлемента свету і яго падмурка [1, с. 448]. Пытанне пра беларускія народныя ўяўленні аб узнікненні камянёў у сувязі са сваім прадметам даследавання закраналі сучасныя вучоныя (Л. Дучыц, І. Клімковіч, У. Лобач, А. Ненадавец, С. Санько, Т. Шамякіна і інш.). Пры гэтым увага звярталася пераважна на матыў акамянення жывых істот. Л. Дучыц і С. Санько прысвяцілі гэтаму матыву слоўнікавы артыкул «Акамянелыя істоты» [2, с. 21], у якім узгадалі характэрныя аповеды пра акамянелага аратага, які быў пакараны разам з валамі за тое, што працаваў на Вялікдзень, пра акамянелых жывёл, волатаў, князёў, жанчын і цэлыя вяселлі, што не саступілі адно аднаму дарогі, і інш. Беларускі фальклорны матэрыял, у якім актуалізаваны вобраз каменя і ўяўленні пра паходжанне апошняга, выкарыстоўваецца замежнымі навукоўцамі. У прыватнасці, у артыкуле «Камень» А. Леўкіеўскай і С. Талстой, які змешчаны ў этналінгвістычным слоўніку «Славянские древности» [1, с. 448], згадваюцца беларускія аповеды пра стварэнне Богам камянёў для таго, каб з іх дапамогай чалавек мог высякаць агонь, а таксама пра з'яўленне на зямлі камянёў у выніку падзення пагаслых зорак. Разам з тым, нягледзячы на тое, што камень з'яўляецца адным з вызначальных чыннікаў міфапаэтычнай мадэлі свету беларусаў, пакуль што адсутнічала спецыяльнае даследаванне беларускіх народных уяўленняў пра паходжанне гэтага элемента ландшафтнага (ці прадметнага) кода беларускай традыцыйнай духоўнай культуры.

Мэта дадзенай працы – вызначыць асаблівасці «міфапаэтычнай этыялогіі» каменя, адлюстраванай у беларускіх фальклорных тэкстах, якія тлумачаць з'яўленне камянёў і іх адметнасцей ці

прычыны набыцця камянямі сакральнага статусу. Для дасягнення пастаўленай мэты гісторыка-генетычнае вывучэнне, якое арыентуецца на дыяхранічны і парадыгматычны разгляд уяўленняў пра паходжанне каменя, дапаўняецца функцыянальна-семантычным даследаваннем.

Паводле **касмаганічных уяўленняў** беларусаў, камень існаваў яшчэ перад стварэннем свету, быў адным з яго першаэлементаў, сродкам і матэрыялам тварэння космасу і выступаў грунтам, стрыжнем, цэнтрам, з якога пачыналася касмізацыя, напрыклад: «Калі свет яшчэ толькі зачынаўся, нідзе нічога не было. Усюды была мёртвая вада, пасярод вады тырчэў нейкі камень. Пярун трымаў у руках жорны, ударыў камень аб камень і выклікаў гром і маланку. Асколкі ляцелі на Зямлю, як стрэлы. Аднойчы адзін з асколкаў трапіў у гэты камень, і адтуль выскачылі тры іскаркі: белая, жоўтая і чырвоная. Упалі іскаркі ў ваду. З гэтага вада ўся скаламуцілася, і свет памуціўся. А калі ўсё пасвятлела, аддзялілася Зямля ад Вады. І пачалося жыццё на зямлі і ў Вадзе» [3, с. 32]. Камень, такім чынам, можа трактавацца як утрымальнік разнастайнасці жыцця, для развіцця якога былі неабходны штуршок, энергія нябесных сіл, адмысловая божая іскра. Верагодна, касмаганічныя ўяўленні кшталту прыведзенага ў імпліцытнай форме прысутнічаюць у наратывах пра пабудову храма на тым месцы, дзе ляжаў камень, пра камень як кропку іерафаніі і змесціва сакральнай сілы [4, с. 465]. Узгадаем таксама замовы, у якіх камень трактуецца як «цар», цэнтр свету (ці іншасвету), указвае на сакральнасць месца, у якім ён знаходзіцца, і на царскі статус тагасветных істот, лакатыўна звязаных з ім.

Камяні ў міфапаэтычнай касмагоніі беларусаў могуць мець нябесную прыроду і ў сваім генезісе звязвацца з праявай боскага (узгадаем тут старазапаветны матыў *цвердз*і нябеснай). А. Леўкіеўская і С. Талстая, як адзначалася вышэй, звярнулі ўвагу на тое, што, паводле міфалагічных уяўленняў славян, камяні былі створаны Богам у акце тварэння свету ці, па беларускіх і польскіх уяўленнях, скінуты з неба [1, с. 448]. «Камяні стварыў Бог», – сцвярджае жыхарка Пастаўскага р-на [5, с. 242]. Між тым нярэдка фіксуюцца ўяўленні, згодна з якімі камяні абавязаны сваім паходжаннем хтанічнаму свету і яго прадстаўнікам (гл. разважанне інфарманта пра Чортаў камень на Полаччыне: *«Можа з неба ўпаў, а можа і з зямлі вырас»* [5, с. 241]). Згодна з польскім аповедам, камяні ўтварыліся з зямлі, прынесенай д'яблам з мора ў левай руцэ, зямля мае праслойку з камянёў, якая раздзяляе слой глебы і ваду, – каб не было камянёў, зямля б была мяккай, як каша [1, с. 448].

Паводле ўяўленняў беларусаў, палякаў, кашубаў, балгараў, сербаў, у першачасы камяні былі падобныя да жывых істот – яны адчувалі, пладзіліся і былі мяккімі; з тых часоў на камянях засталіся паглыбленні – сляды ног Бога, Божай Маці, святых, нячыстай сілы [1, с. 448] («выймачкі – гэта чорт танцаваў» [5, с. 241]). На Полаччыне пра выемкі на Святым (Богавым) камені апавядаюць: «даўно Бог ішоў, ступіў, ну во і слядкі. А тыя малыя (слядкі) – дык то, ці кот з ім (Богам) ішоў ці сабака» [5, с. 237]. Паводле нашага запісу з в. Ляплёўка Брэсцкага р-на, «в Ставах есть, там родник открылся. И есть там камень. То местечко огорожено. И люди туда ходят. И ленточки цепляют, и молятся. И там след виден на этом камне Божей Матери. Она шла и ступила на этот камень. След остался» [ФЭАБ]. Мяккасць камянёў можа адносіцца да часоў «ледніка»: «як ляднік быў, то людзі хадзілі па камянях. Камяні тады мягкія былі» [5, с. 203].

Лічаць таксама, што камяні раслі (параўн. загадку кніжнага паходжання: «Без кораня, а расце. – Камень» [6, с. 31]) і растуць «па сённяшні дзень» [5, с. 242]. Эквівалентнымі каменю вобразамі выступаюць снег і соль, якія, паводле загадак, таксама растуць без кораня [6, с. 51, 242]. Беларусы лічаць, што расці могуць не толькі камяні, але і каменныя крыжы. Адносна новай святыняй Тураўшчыны, як вядома, з'яўляецца невялікі каменны крыж, які «расце» з зямлі на мясцовым Барысаглебскім могільніку. Сярод паломнікаў гэты крыж звязваецца з імем Свяціцеля Кірылы Тураўскага. Апавядаюць, што камень можа ў працэсе росту паступова набываць форму крыжа (*расці крастом*), што сведчыць пра яго святасць: «У нас у цэркві ў Хотомлі е камэнь. Вон росце. А росце вон крастом. Знайшоў яго одзін чоловек. Вон ораў поле воламі. Одзін вол зачапіў гэтой камэнь і чэрэз час здох, бэз болезней. На том месці, дзе знайшлі камня, построілі цэркоў. Вон і зарэ там стоіць, росце з зямлі. Кажуць, шчо одна слепа жонка прыклоніласа до его і сразу стала бачыць. Гэто святы камэнь» [ФЭАБ; Хотамель Столінскага р-на].

Хуткі рост камянёў можа трактавацца як вынік уздзеяння на іх нячыстай сілы. Так, пра камень у Валілах апавядаюць наступнае: чорт пабачыў каля свайго балота зморанага падарожніка,

які прысеў адпачыць; баючыся, што чалавек застанецца тут назаўсёды, чорт вырашыў забіць яго каменем: «Выкалупаў нячысты з багны каменьчык, бы зярня бобу са струка, папляваў на яго, перакінуў разы са тры з адной сваёй калматай лапы ў другую, і тут уваччу маленькі камушок у аграмадны валун абярнуўся…» [3, с. 371].

Паводле іншых беларускіх уяўленняў, першапачаткова працэс росту камянёў быў вельмі хуткім, а пазней, па волі Бога, пашкадаваўшага людзей, жыццёвая прастора якіх увесь час звужалася з-за павелічэння памеру камянёў, гэты працэс стаў марудным, практычна непрыкметным [7, с. 49]. Істотнае запавольванне росту камянёў у параўнанні з першачасамі можа нічым не абгрунтоўвацца, толькі падкрэсліваецца здатнасць камянёў расці ў максімальна сакральныя перыяды (дакладней – моманты) календара: «Як толькі пачуецца ў царкве першы спеў “Хрыстос уваскрос”, камяні павялічваюцца да вымаўлення апошняга слова песні, але толькі гэты рост настолькі малы і непрыкметны, што, пражыўшы тысячу гадоў, чалавек убачыў бы, што камень вырас толькі на таўшчыню чалавечага мезеннага пазногця» [8, с. 21]. Каб перадаць ідэю немагчымасці, у замовах і песенных тэкстах выкарыстоўваецца вобраз каменя з карэннем, г. зн. здольнага да росту [9, с. 202; 10, с. 339]. Беларусы і палякі апавядаюць, што камяні перасталі расці, калі Бог пракляў людзей і зямлю за грахі [1, с. 448]. Паводле беларускіх матэрыялаў, рост камянёў спыніўся ў выніку праклящця Божай Маці, якая, збіўшы аб камень палец, вымавіла: «Ах, дай Божа, каб вы ўжэ гэтакія не раслі!» [11, с. 42]. Згодна з міфалагічнай логікай, у першачасы камяні былі такімі ж жывымі, як расліны, жывёлы, людзі, заклятыя ж камяні перасталі расці, як і заклятыя зямля ды расліны не плодзяць.

Значная частка беларускіх **этыялагічных легендаў** тлумачыць паходжанне канкрэтных камянёў (вялікіх, антрапа- ці зааморфных або незвычайна размешчаных у прасторы), выкарыстоўваючы прынцып метамарфозы, ператварэнняў людзей, жывёл, ландшафтных аб’ектаў ці прадметаў (акамянелыя істоты, паселішчы, храмы, азёры). Камяні, з якімі звязаны гэтыя ўяўленні, як правіла, з’яўляюцца культавымі (іх на Беларусі налічваецца больш за 300): «Каменне – гэта не што іншае, як зачараваная зямля, людзі, жывёлы, пні, спечаныя хлябы і г. д. Што гэта так, відаць з таго, што многія камяні захоўваюць формы нейкіх рэчаў, а таксама з таго, што любы камень, перапалены ў лазні ці ў восеці на каменцы, ці ў печы або на вогнішчы, ператвараецца спачатку ў жарству, а потым, паступова драбнеючы, яднаецца з зямлёй – сваёй першапачатковай крыніцай» [8, с. 210]. Паводле беларускіх вераванняў, чараўніца можа чалавека і сама сябе «перавярнуць усім, што толькі е на свеце і жывое, і нежывое, нават і каменем…» [12, с. 94]. Універсальным для шэрага этыялагічных легендаў можна лічыць матыў паходжання камянёў ад чалавека – праклятага, грэшнага: пакаранага за парушэнне забароны (напрыклад, працаваць у свята, азірацца, распаўсюджваць сакральную інфармацыю ў прафанным свеце), а таксама за ляноту, упартасць, знявагу, нешанаванне кагосьці (чарадзея, старца-вандроўніка), злачынства, у прыватнасці забойства [7, с. 49]. Невыпадкова ў легендах разбойнік, які кідаўся з нажом на прывід прыгожай Кінгі, становіцца каменем [13, с. 90]; жанчыны з дзецьмі, якія парушылі забарону старога (жабрака) азірацца на пакінуты імі горад (вёску), ператвараюцца ў камень [13, с. 98, 107]; жыхары вёскі не пускаюць нанач падарожнага і, пакараныя за гэта, ператвараюцца ў каменне: «...аж нема там хатак, дзе яны стаялі, толькі рад каменя, бы валы на пашы» [14, с. 197–198]. Яшчэ і сёння ў в. Тураснолле Ушацкага р-на апавядаюць: «Ішла жэншчына, нешта сказала на Бога, атвярнулася, сказала і ў камень прэўрацілася. І камень там ляжыць бальшой» [5, с. 244]. Некаторыя валуны лічацца акамянелымі шаўцамі, краўцамі, князямі, асілкамі (параўн. бел. *асла* ‘камень’) [2, с. 21]. У паданні пра паходжанне ракі Віліі каменем становіцца закаханы ў Вельяну Сцяпан-кравец, прычым адбываецца гэта пад уздзеяннем нячыстай сілы [13, с. 93]. Частотным матывам наратываў пра пакрыўджанага чараўніка, якога належным чынам не прывіталі вясельнікі, з’яўляецца ператварэнне крыўдзіцеляў у камяні. Акамяненне вясельнікаў можа быць вынікам іх сустрэчы з лютым змеем ці звычайнай упартасці: ні адзін з двух вясельных паяздоў, што ехалі насустрач адзін аднаму, не саступіў дарогі. У в. Гарэлкі Жабінкаўскага р-на нам расказалі пра два вялікія і адзін малы камяні, у якія калісь нібыта ператварыліся дзіця і кумы, што ехалі яго хрысціць ды ўчынілі грэх пралюбадзейства. Матыў ператварэння людзей у камень за ўчынены імі грэх характэрны і для іншых славянскіх фальклорных традыцый – у прыватнасці, рускай, украінскай, польскай, сербскай, македонскай.

Часта камяні, што з’явіліся ў выніку метамарфозы жывых істот, надзяляюцца ў народнай культуры тым жа статусам, што і камяні надмагільныя. Надмагільны камень уяўляецца ўтрымальнікам душы чалавека, месцам яе лакалізацыі (як і дрэва, вырасшае на месцы смерці чалавека).

У беларускай фальклорнай традыцыі да нашых дзён захаваліся матывы ўзнікнення каменя ў выніку цудоўнага выратавання дзяўчыны ад гвалтаўніка. Паводле легенды «Пястун-камень», прыгожая дзяўчына, за якой беглі салдаты, у роспачы вымавіла: «Лепш бы я каменем качалася, чым ім на пацеху дасталася»; «І гэта сказаўшы, дзяўчына тая ў етат пястун-камень абярнулася» [3, с. 371]. Падобныя творы, акрамя таго, што характарызуюцца актуалізацыяй матыву акамянення як выратавання, Боскага заступніцтва, і адначасова як прычыны з’яўлення каменя, могуць быць пастаўлены ў шырокі кантэкст касмаганічных легендаў аб паходжанні элементаў космасу з антрапаморфнай істоты, больш вузка – у кола сюжэтаў аб дзяўчыне, якая праследуецца і ператвараецца ў розныя прыродна-ландшафтныя аб’екты. З камянямі асацыіраваліся таксама велізарныя косці, якія нібыта належалі першым дзікім людзям-асілкам [ПА; Піркі Брагінскага р-на]. Камяні, такім чынам, узнікаюць ад людзей, волатаў, а людзі (часткі іх цела) могуць утварыцца з камянёў: «Велізарныя косці як прыналежныя першым людзям (першапродкам) упісваліся ў сістэму кніжна-народных уяўленняў пра зямлю як першае “чалавечае цела” (напрыклад, зямля ўяўляецца як жаночае цела, косці якога – гэта камяні ці карані раслін, валасы – трава) і пра першага чалавека – Адама, створанага з прыродных элементаў і стыхій» [15, с. 100]. Генетычныя сувязі камянёў з людзьмі, магчыма, высвечваюцца ў традыцыі прыпісвання камяням (увасабленне мужчынскага пачатку) сямейных адносін – камяні маюць жонак, як шырока вядомы Сцёп-камень ля вытокаў ракі Вяллі. Каля яго расце сасна, якая асэнсоўваецца як жонка згаданага каменя. Паводле сучаснага аповеду з Докшыцкага раёна, у Сцёп-камень і сасну Куліну ператварыліся Сцяпан, які на Вялікдзень араў ніву, ды праклаўшая яго жонка Куліна [5, с. 235]. Матыў акамянення розных істот характэрны таксама казачнай прозе. У казцы «Сын селяніна вызваляе царэўну ад смерці» старая ведзьма сцябае хлопцаў і *звяроў* дубчыкам і тыя камянеюць [16, с. 128]. Паводле іншай казкі, адзін з незвычайна народжаных асілкаў ратуе ад змея царэўну, ведзьма ператварае яго ў камень, брат-асілак героя перамагае ведзьму і вызваляе акамянелага брата ад чар [16, с. 128, 608].

Акамяняць, паводле беларускіх сведчанняў, могуць таксама жывёлы – як свойскія, так і дзікія: конь, вол, бык, карова, сабака, кот, гусак, воўк, мядзведзь, вуж, змей. Напрыклад, у легендзе пра вёску «Камень» стары пракляў свайго слабага каня, які тут жа разам з возам ператварыўся ў цёмнашэры, у тон масці, камень [13, с. 133]. Паводле іншай легенды, каменем становіцца вуж, які лётае па небе і носіць золата і срэбра людзям, што прадалі душу чорту [3, с. 363]. Матыў акамянення жывёл адбіўся ў шматлікіх тапонімах, звязаных з зааморфнымі камянямі. З валуноў, у якія нібыта ператварыліся жывёлы, вядомы Воўк, Мядзведзь, Бык, Карова, Кот, а таксама Вужыныя і Змеевы камяні [2, с. 20].

Камяні, паволе твораў розных фальклорных жанраў, могуць паходзіць ад артэфактаў. У баладах з матывамі ператварэння чалавека ў прыродныя аб’екты камянямі становяцца прадметы, якія яму належалі, напрыклад вёдры [10, с. 48]. У паданнях камень застаецца ад храма, які за грахі людзей пайшоў у зямлю з усімі, хто маліўся там [3, с. 370], ці ад горада (гарадзішча), што таксама праваліўся пад зямлю [5, с. 244]. У казках часова акамянелым можа быць цэлае царства [16, с. 612]. У замовах працэс акамянення можа прыпісвацца кветкам і немачам. Паводле замоў ад рожы, як камянее, сохне, гіне ружа, так павінна знікнуць хвароба [17, с. 20]. Семантычна тоесным акамянеласці з’яўляецца адзеравяненне (гл. замову: «Ішоў Хрыстос па полю, нёс тры розы: адна акамянела, другая адзервянела, трэцяя згінела...» [9, с. 216], а таксама легенду-быліčку пра тое, як жанчыне на вячорках не хапіла пары для танцаў і яна пусцілася ў скокі з іконай: «І… з той іконою нэ вспіла вона пару раз обэрнутыся, і стала вона… <u>Окаменела. Ілі як деревянная стала</u>…» [4, с. 447]).

Адзначым, што адна група беларускіх фальклорных тэкстаў фіксуе ўяўленні пра незваротнасць ператварэння каго-небудзь ці чаго-небудзь у камень, другая – сцвярджае магчымасць набыцця ператвораным у камень аб’ектам першаснага стану. Напрыклад, паводле казкі «Мёртвае цела», перамяніцца ў камень павінен той, хто пачуе размову воранаў ды камусьці пра гэта раскажа. Адратаваць яго можна, толькі памазаўшы гэты камень крывёй няхрышчанага дзіцяці [2, с. 21]. У творах няказачнай прозы метамарфоза людзей і жывёл у камяні даволі часта выяўляецца як

некачатковая, такія камяні крывавяць, напрыклад: «…За тое, што не паслухалася старога, яна ператварылася ў камень. І цяпер гэты камень стаіць у возеры недалёка ад берага, нагадваючы жанчыну з дзіцем на руках. Кажуць, што калі хто даплыве да каменя і дакранецца яго рукою, то з каменя выступае кроў» [13, с. 98]. Кроў цячэ і з акамянелых валоў, на якіх калісь гаспадар араў на Вялікдзень [3, с. 367], а таксама з крыжа, які быў пастаўлены на месцы, дзе акамянелі людзі [3, с. 368]. Нярэдкія ўказанні на тое, што камяні захоўваюць знешні выгляд і размяшчэнне ў прасторы рэалій, з якіх яны ўзніклі, – як у аповедзе пра акамянелую вясельную дружыну [3, с. 370]. Паводле запісу з Полаччыны, жонка пракляла араўшага быкамі ў полі мужа: «І вот чалавек абраціўся у камень. Усё – і плечы тамака былі, і ўсё…» [5, с. 234]. Больш за тое, у пэўны час акамянелыя істоты (ці прывіды) могуць набываць здатнасць рухацца, выдаваць гукі, выконваць свае «прыжыццёвыя» функцыі. Апавядалі, напрыклад, што ад гаспадароў, якія зваламі і сабакам выйшлі працаваць у поле на Вялікдзень і ўсе разам акамянелі, засталіся толькі каменныя валы. І з-пад іх выскоквае сабачка шэранькі, ганяе авечак, што там пасвяцца, і потым знікае [3, с. 368]. У легендзе пра камень Гомсін сцвярджаецца, што калі да яго нахіліцца, можна пачуць, як *спявае певень і стучыць шавецкі малаток*, бо ў гэты камень быў ператвораны шавец са сваёй гаспадаркай за тое, што працаваў на Вялікдзень [3, с. 367].

Падводзячы вынікі, адзначым, што «міфалагічная этыялогія» камянёў уключае наступныя асноўныя кампаненты: існаванне камнёў перад стварэннем свету ці іх крэацыя ў акце светастварэння дэміургам (нябеснай ці хтанічнай прыроды); з'яўленне камянёў у «нячыстых» топасах (на месцах пакарання Богам ці нячыстай сілай / цудоўнай метамарфозы чалавека / забойства / разбуранай / праваліўшайся святыні, гарадзішча); цудоўнае ўзнікненне каменя з дзікіх і свойскіх жывёл, міфалагічных істот, ландшафтных аб'ектаў, артэфактаў.

Атрыманыя вынікі могуць быць пашыраны і выкарыстаны ў межах семіётыкі фальклору, гістарычнай паэтыкі і паслужыць апрабаванай базай для далейшай распрацоўкі праблем мадэліравання разнастайных чыннікаў карціны свету праз ландшафтны код, рэканструкцыі касмаганічных уяўленняў нашых продкаў, даследавання спецыфікі беларускіх этыялагічных легендаў.

## Скарачэнні

ПА – Палескі архіў Інстытута славяназнаўства РАН (Масква).

ФЭАБ – Фальклорна-этнаграфічны архіў вучэбнай фальклорна-краязнаўчай лабараторыі БрДУ імя А. С. Пушкіна.

## Літаратура


1. Славянские древности: Этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – М.: Междунар. отношения, 1999. – Т. 2: Д – К. – 699 с.

2. Міфалогія беларусаў: Энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – 607 с.

3. Легенды і паданні / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 552 с.

4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2009. – Т. 4: Брэсцкае Палессе: у 2 кн., кн. 2. – 863 с.

5. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч., ч. 1. / склад. А. У. Лобач, У. С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – 292 с.

6. Загадкі / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 448 с.

7. *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

8. *Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. – Витебск: Витеб. губ. тип., 1897. – 308 с.

9. Замовы / уклад. Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – 597 с.

10. *Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева. – Мінск: Беларус. навука, 1999. – 392 с.

11. Зямля стаіць пасярод свету… Беларускія народныя прыкметы і павер'і: у 3 кн. / уклад. У. Васілевіч. – Мінск: Маст. літ., 1996–1999. – Кн. 1. – 1996. – 591 с.

12. Зямная дарога ў вырай: Беларускія народныя прыкметы і павер'і: у 3 кн. / уклад. У. Васілевіч. – Мінск: Маст. літ., 1996–1999. – Кн. 3. – 1999. – 654 с.

13. Дрэва кахання: Легенды, паданні, сказы / склад. А. І. Гурскі. – Мінск: Юнацтва, 1993. – 222 с.

14. *Сержпутоўскі, А. К.* Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 270 с.

15. *Белова, О. В.* Фольклор и книжность: миф и исторические реалии / О. В. Белова, В. Я. Петрухин / отв. ред. С. М. Толстая; Ин-т славяноведения РАН. – М.: Наука, 2008. – 263 с.
16. Казкі ў сучасных запісах / уклад. К. П. Кабашнікава, Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 663 с.
17. Замовы / уклад У. А. Васілевіч, Л. М. Салавей. – Мінск: Беларусь, 2009. – 519 с.

*I. A. SHVED*

**“MITHOPOETIC ETIOLOGY” OF STONE IN THE BELARUSIAN FOLKLORE**

## Summary

Article is devoted to the reconstruction of “mythopoetic etiology” of stone reflected in Belarusian folk texts that explain the appearance of stones and especially their shape, composition, location in space.

There held a historical-genetic and functional-semantic analysis of cosmogonic legends and ancient stories to develop their “traditions”.

Also it justifies a “new situation” – new in the sense that it did not exist with “ancientry” which tells the story of the “small world” and origin and sacralization of the specific stones that fill it.